**“Библиотека Н.А. Янчука: частная коллекция белорусского ученого-слависта в фонде Национальной библиотеки Беларуси” (2008– 2011 гг.)**

Работа была зарэгістравана ў БелІСА. Мэта праекта – выяўленне найбольшай колькасці экзэмпляраў з былога прыватнага кнігазбору вучонага і пісьменніка Мікалая Андрэевіча Янчука (1859–1921) у фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, навуковае бібліяграфічнае апісанне ўсіх калекцыйных адзінак, даследаванне асобных экзэмпляраў, агульная характарыстыка калекцыі, папулярызацыя асобы М.А. Янчука ў СМІ. Бібліятэка Янчука паступіла ў фонд Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў 1922 г. і сёння налічвае каля 2000 экз. кніг і часопісаў. Гэта друкаваныя выданні канца XVIII – пачатку XX ст. на беларускай, рускай, украінскай, польскай, французскай і іншых мовах. Тут захоўваюцца першыя літаратурныя творы беларускіх класікаў, рэдкія прыжыццёвыя выданні мастацкай літаратуры пісьменнікаў розных краін, зборнікі славянскага фальклору, рэдкія слоўнікі і календары XIX ст., альбом унікальнай калекцыі калядных пісанак, праграмы для збору фальклорных запісаў. Шмат кніг утрымліваюць дароўныя надпісы. Адметна, што ў складзе дадзенай калекцыі былі выяўлены фрагменты з былых прыватных бібліятэк іншых вядомых асоб: рускага перакладчыка-лацініста і паэта Сярэбранага веку Мікалая Сяргеевіча Пазнякова, Ганны Аленінай – музы А.С. Пушкіна. Найбольш каштоўныя экзэмпляры бібліятэкі М.А. Янчука алічбаваны.